№ 20 (613)
Май 2016 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

У нумары:

☞ Ініцыятыва: *«Краязнаўчая газета» – роднаму краю!* – стар. 2

☞ Стагоддзі культуры: *фальклор беларускай глыбінкі* – стар. 4

☞ Згадкі: *У. Ігнатоўскі, І. Луцкевіч і Б. Сачанка* – стар. 5 і 7

☞ Асоба: *педагог і культуролаг А. Пяткевіч* – стар. 6

31 мая – прысвятак Фядота

Прыкмячалі: «Як на дубе апушка – у Фядота поўная аўса кадушка»

На фота Алеся САЧАНКІ: дуб у ваколіцах в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна

На тым тыдні...

✓ **17 мая** ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры ў Мінску пачала працаваць выстаўка **«Беларускія землі на геаграфічных картах XVI – пачатку XXI стагоддзя»**. У мінчанаў і гасцей горада з'явілася ўнікальная магчымасць убачыць арыгінальныя выданні картаў XVI – XXI стст., сярод якіх карта Вялікага Княства Літоўскага 1595 г., створаная вядомым еўрапейскім картографам Герардам Меркатарам, «Радзівілаўская карта» 1613 г., карта Польшчы XVII – XVIII стст. Усяго на выстаўцы прадстаўлена 27 картаў з прыватных калекцыяў.

Тэрыторыя Беларусі ў XVI – XVIII стст. уваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, а з канца XVIII ст. – у склад Расійскай імперыі, таму гісторыя картаграфіі беларускіх земляў непарыўна звязаная з гісторыяй развіцця заходнееўрапейскай і рускай картаграфіі. Картаграфічныя працы – гэта ўнікальныя дакументы, помнікі канкрэтнага часу, якія дазваляюць прасачыць асаблівасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнага развіцця беларускіх земляў у розныя эпохі, пазнаёміцца з развіццём заходнееўрапейскай і беларускай картаграфіі.

✓ **18 мая** ў межах сёлетняга Года культуры Нацыянальны гістарычны музей урачыста адкрыў арт-прастору ў дворыку музея і прадставіў **выстаўку фотамастачкі Марыны Бацюковай «Сула. Непарыўнае»**.

М. Бацюкова даследавала жыццё ў вёсках Неглюбка і Стаўбун Гомельскай вобласці пад час абраду «Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)». Фотамастачка з'яўляецца спецыялістам у галіне дакументальнай і канцэптуальнай фатаграфіі. Асноўныя тэмы яе фотадаследаванняў – штодзённасць, псіхалагічны стан асобы, стасункі чалавека з навакольным асяроддзем і паводзіны чалавека ў грамадстве.

✓ **18 мая** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася стацыянарная **выстаўка «У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа»**, якая размясцілася ў адным з гаражоў народнага паэта. Выстаўка знаёміць наведнікаў музея з паўсядзённым жыццём Я. Коласа і асобнымі знакавымі падзеямі 1936 – 1956 гг.

✓ **18 мая** ў Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка адбылася **прэзентацыя твора вядомага беларускага жывапісца Івана Хруцкага «Партрэт А. Міцкевіча»**. Палатно было знойдзенае ў Полацку ў 2010 годзе. У фондах музея-запаведніка ў складзе калекцыі жывапісных і графічных працаў праўнучкі жывапісца Ядвігі Мацяеўскай (захоўваецца ў фондах з 1997 года) быў знойдзены партрэт пэндзля самога І. Хруцкага. Пасля праведзеных навуковых даследаванняў і рэстаўрацыі карціна была прадстаўленая гледачам.

✓ **20 мая**, у дзень святкавання з'яўлення Жыровіцкай іконы Божай Маці, адбыўся **першы «Жыровіцкі фэст»**. Традыцыйна ў гэты дзень у манастыр прыязджаюць паломнікі з розных гарадоў Беларусі і суседніх краінаў. Пасля святочнага богаслужэння ў Свята-Успенскім Жыровіцкім манастыры і хрэснага ходу пачаўся фестываль духоўных спеваў, у якім узялі ўдзел каля трыццаці харавых калектываў, вакальных гуртоў і сольных выканаўцаў.

✓ **21 мая** ў Слоніме, на радзіме кампазітара Міхаіла Клеафаса Агінскага, аўтара паланэзу «Развітанне з радзімай», прайшоў **XII міжнародны фестываль «Паланэз-2016»**.

Вядома, што да 1939 г. у Слоніме аркестр мясцовай пажарнай каманды два разы на дзень іграў паланэз як сігнал дакладнага часу. Фестываль пачаўся традыцыйна ад пажарнай вежы, а потым усе ўдзельнікі свята прайшлі па цэнтральнай вуліцы да мясцовага Цэнтра культуры. Там паланэзы Агінскага гралі, танцавалі, спявалі на розных мовах. Па сутнасці, гэта фестываль аднаго твора, але ў кожнага выканаўцы ён гучаў па-рознаму. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел музычныя і танцавальныя калектывы з розных гарадаў Беларусі, Польшчы, Літвы і Латвіі.

✓ **22 мая** ў Вільні Таварыства беларускай культуры ў Літве ўсталявала **мемарыяльную шыльду ў гонар святара і паэта Казіміра Сваяка**. Яе аўтар – скульптар Ігар Засімовіч, мецэнат – Мікіта Забуга. Шыльда ўсталяваная на будынку па вуліцы Дзіджоі, 17.

Урачыстае адкрыццё шыльды адбудзецца 19 чэрвеня і пачнецца з набажэнства ў касцёле святога Барталамея з удзелам духавенства Літвы і Беларусі. Пасля літургіі адбудзецца асвячэнне шыльды.

Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Ініцыятыва

Акцыя «“Краязнаўчая газета” – роднаму краю!»

Апошнім часам шмат гавораць і пішуць пра тое, што зніжаецца колькасць падпісчыкаў на перыядычныя выданні. Не абышло гэта і «Краязнаўчую газету». Чытачы выдання аб праблеме ведаюць добра. Таму шэраг даўніх пастаянных аўтараў і падпісчыкаў «Краязнаўчай газеты» выступае з ініцыятывай, скіраванай на папулярызацыю нашага выдання.

Пераважная большасць усіх нас паходзіць з розных паселішчаў Беларусі. Пасля заканчэння навучання лёс закідваў нас у розныя куткі краіны, дзе і засталіся настала. Але мы не парываем сувязі з роднымі мясцінамі (якія часамі называюць «малой радзімай»), са сваімі школамі, калі яны яшчэ не закрытыя, з тамтэйшымі бібліятэкамі ды іншымі ўстановамі, з мясцовымі краязнаўцамі, з людзьмі, неабыякавымі да культурнай спадчыны сваёй Вялікай Радзімы. Па магчымасці і мы самі пішам ды друкуем у «Краязнаўчай газеце» артыкулы пра даўніну і сучаснасць нашых родных мясцінаў. Вось толькі... Гэта не заўсёды могуць прачытаць жыхары тых мясцінаў, пра якія ідзе гаворка. Прычынаў тут некалькі. На жаль, не кожная навучальная або культурніцкая ўстанова, нават ведаючы пра «Краязнаўчую газету», мае магчымасць падпісацца на яе з адпушчаных на падпіску сродкаў.

Таму і вырашылі мы **РАСПАЧАЦЬ АКЦЫЮ «“Краязнаўчая газета” – роднаму краю!»** Яна паспрыяе не толькі падпісцы на выданне, але і дапаможа аператыўна данесці інфармацыю пра новыя знаходкі ў даследаваннях канкрэтнага рэгіёна, умацуе зямляцкія повязі. Думаецца, многія з неабыякавых людзей у стане падпісаць на газету (на паўгода або на адзін, тры месяцы) сваю школу, якую некалі скончыў ці скончыла, бібліятэку, што працуе ў іх на радзіме, іншую навучальную ці культурніцкую ўстанову, урэшце – мясцовае прадпрыемства, прыход праваслаўнай царквы або каталіцкага касцёла, пэўную асобу, якая зацікаўленая ў атрыманні «Краязнаўчай газеты» і яе распаўсюджванні, але з нейкіх прычынаў не мае фінансавай магчымасці падпісацца (як вядома, нашыя краязнаўцы багатыя духоўна, але часцяком незаможныя грашова).

Рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» будзе пастаянна інфармаваць на сваіх старонках, хто, куды і на які перыяд аформіў падпіску, каб на месцах арыентаваліся і маглі своечасова падоўжыць яе.

Заклікаем чытачоў нашага выдання, падпісчыкаў і аўтараў, а таксама іншых неабыякавых людзей, далучыцца да акцыі **«“Краязнаўчую газету” – роднаму краю!»** Давайце разам пашырым кола чытачоў нашага з вамі выдання. А таксама на справе выкажам сваю любоў і заклапочанасць станам газеты, і любоў да роднага куточка. Праз гэта будуць мацавацца і зямляцкія повязі выхадцаў з канкрэтнай мясцовасці, якія раскіданыя па розных мясцінах краіны.

Першымі падпісалі школы, якія яны скончылі, галоўны рэдактар выдання Уладзімір Гілеп (выпускнік 1955 г. школы № 1 г. Слуцка) і сябра рэдкалегіі газеты Анатоль Бутэвіч (выпускнік 1966 г. Сноўскай СШ Нясвіжскага раёна). Дырэктар фонду «Любчанскі замак» Іван Пячынскі выпісаў «Краязнаўчую газету» для школы г.п. Любча – мястэчка, дзе ён нарадзіўся. Адгукнуліся на наш заклік і новыя падпісчыкі «КГ» у Мінску Аляксандра Вадап'янава і Аляксандр Сіраж.

Чакаем прапановаў у падтрымку нашай акцыі. Далучайцеся!

Сябры! Запрашаем на чарговую Сустрэчу краязнаўцаў у «Краязнаўчай газеце». Чакаем вас 3 чэрвеня з 12 да 15 гадзінаў. Можна будзе паглядзець відэафільм Юрыя Клеванца пра Асіповіччыну.

Уганараванне

Пятнаццаты лаўрэат Ёлшынскай прэміі

З 1992 года Рагачоўскім краязнаўчым цэнтрам пры фінансавай падтрымцы райвыканкама актыўным мясцовым краязнаўцам уручаецца прэмія ў гонар мужа і жонкі Ёлшыных, якія жылі ў Рагачове на мяжы XIX і XX стагоддзяў і вызначыліся сваёй мецэнацкай дзейнасцю.

Сёлета 3 мая ўрачыста віншавалі пятнаццатага лаўрэата – за 2015 год. Ім упершыню стаў жлабінчанін Мікалай Шуканаў. Нагадаю, што ён аўтар шматлікіх публікацыяў па гісторыі Рагачоўшчыны. У большасці гэта артыкулы па праваслаўным рэгіянальным краязнаўстве. Акрамя ўсяго, Мікалай Васільевіч браў актыўны ўдзел у адраджэнні мясцовай святыні – Свята-Троіцкай старажытнай крыніцы непадалёк вёскі Свержань, добраўпарадкаванні разбуранага ў гады савецкай улады храма ў гэтым жа населеным пункце, пастаянна ўдзельнічае ў краязнаўчых выстаўках, што праходзяць у Рагачове.

Дырэктар краязнаўчага цэнтра Генадзь Цітовіч уручыў новаму лаўрэату ганаровы дыплом і грашовую прэмію. А яшчэ адзін лаўрэат, Міхаіл Міронаў, – знак лаўрэата.

М. Шуканава з узнагародай павіншавалі іншыя лаўрэаты: Міхаіл Альха і Міхаіл Нікалаенка, аўтар гэтых радкоў.

Аляксандр ПАТАПАЎ, лаўрэат Ёлшынскай прэміі
На здымку: Мікалая Шуканава (другі справа) з узнагародай віншуюць: злева направа – Генадзь Цітовіч, Міхаіл Нікалаенка і Міхаіл Міронаў

Фота Раісы БАРАВОЙ

Супрацоўнікі «Краязнаўчай газеты» шчыра радыя поспехам нашага даўняга падпісчыка і аўтара. Цешыць, што ягоная праца адзначаная. Хай будуць і новыя ўзнагароды, сп. Шуканаў!

Рудабельская зямля – тэрыторыя народнай культуры

Рудабельская зямля – гэта край самабытнай народнай культуры. За шмат стагоддзяў сваёй гісторыі рудабельцы стварылі вусна-паэтычныя скарбы, выпрацавалі цікавыя культурныя традыцыі, пакінулі нашчадкам каштоўную духоўную спадчыну. Народнае мастацтва, фальклор былі і застаюцца невычарпальнымі крыніцамі, якія жывяць літаратуру і мастацтва. У багатай духоўнай спадчыне рудабельцаў адлюстраваны жыццё народа, яго гісторыя, маральныя ідэалы, досвед, спадзяванні.

У сузор'і мясцовых культурных традыцыяў і талентаў асаблівае месца займае Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня». Сёлета, у Год культуры, ён будзе ўжо дзявятым і пройдзе з 23 па 26 чэрвеня.

Супрацоўнікі ўстаноў культуры раёна вядуць сістэматычную працу па захаванні і перадачы духоўнага і матэрыяльнага скарбу рэгіёна дзецям і моладзі. У межах фестывалю з пачатку года ў бібліятэчнай сістэме раёна дзейнічае інтэрактыўны праект «Бібліятэка – тэрыторыя народнай культуры». Мэты праекта – праз розныя формы індывідуальнай і масавай працы далучыць дзяцей і моладзь да розных праяваў традыцыйнай народнай творчасці, навучыць спасцігаць народнае мастацтва ад мясцовых носьбітаў народнай культуры. Вялікую працу па зборы фальклорных матэрыялаў робяць аматарскія аб'яднанні, арганізаваныя пры бібліятэках. Распрацаваныя розныя па форме і змесце мерапрыемствы: сустрэчы з мясцовымі майстрамі, фальклорныя экспедыцыі, краязнаўчыя гадзіны, гасцёўні, святы, майстар-класы і інш.

Раённыя ўстановы культуры і адукацыі далучыліся да «берагінінага» руху, каб праз засваенне і вывучэнне традыцыйнай мастацкай культуры захаваць для наступных пакаленняў спадчыну свайго краю.

Л. ВЫРВІЧ,
метадыст Цэнтра культуры і вольнага часу Акцябрскага раёна

Фота Наталі КУПРЭВІЧ

«Я вазьму такую, к якой любасць чую...»

У межах Міжнароднага дня музеяў 18 мая Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы чакаў усіх зацікаўленых на адкрыцці ўнікальнай выстаўкі «Ісці супольна праз усё жыццё», прысвечанай 100-годдзю вянчання Янкі Купалы і Уладзіславы Станкевіч.

Ідэя выставачнага праекта – у новым святле прадставіць Янку Купалу і іншых беларускіх літаратараў, сяброў паэта альбо прадаўжальнікаў яго творчай справы, і ўбачыць знакамітых майстроў слова такімі, якімі бачылі іх каханыя жонкі, з якімі яны стваралі сям'ю, гадавалі дзяцей, цешыліся ўнукамі...

Да праекта далучыліся Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, а таксама нашчадкі творцаў. Дзякуючы такому шырокаму супрацоўніцтву можна было даведацца пра гісторыю кахання і стварэння сям'і Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Уладзіміра Дубоўкі, Петруся Броўкі, Максіма Лужаніна, Кандрата Крапівы, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, Васіля Быкава, Уладзіміра Скарынкіна. Гэтыя прыгожыя гісторыі кахання і натхнілі іх на выдатныя літаратурныя шэдэўры.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Пашпарты Луцкевічаў з пазнакамі аб шлюбе

Кніжная навінка

Беларускія шляхцянкі ў расійскім дваранстве



Днямі набыў кнігу «Дваранкі беларуска-літоўскіх губерняў у канцы XVIII – першай палове XIX ст.». Яе напісала Наталля Анофранка. Кніга пабачыла свет у выдавецтве «Беларуская навука». Рэцэнзентамі манаграфіі з'яўляюцца кандыдаты гістарычных навук Алена Філатава і Наталля Гардзіенка. Наклад кнігі ўсяго 200 асобнікаў.

У манаграфіі ідзе размова аб прадстаўніцах вышэйшага саслоўя былой Рэчы Паспалітай у складзе дваранства Расійскай імперыі. Выяўленыя агульныя рэгіянальныя тэндэнцыі развіцця шлюбна-сямейнай сферы ў беларуска-літоўскіх губернях; прааналізаваная спецыфіка жаночай адукацыі; раскрытыя прычыны і формы праяўлення грамадскай і палітычнай актыўнасці прадстаўніцаў дваранскага саслоўя.

Манаграфія, зазначаюць выдаўцы, прызначаецца для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі XVIII – XIX стст.

Аляксей ШАЛАХОЎСКІ

Гаркавае дзяцінства

Ветэран-педагог, паэтка Джэма Пугачэўская нядаўна сустрэлася з вучнямі аб'яднання па інтарэсах «Літаратурнае краязнаўства» Палаца дзяцей і моладзі г. Наваполацка. Джэма Іванаўна – кіраўнік аб'яднання настаўнікаў-ветэранаў «Факел», акрамя гэтага яна арганізавала ў Дзісне, дзе жыве ўлетку, літаратурнае аб'яднанне «Чырвоны ветразь». Вершы паэткі друкуюцца ў мясцовых выданнях, выходзяць у калектыўных зборніках.

Сустрэча з вучнямі мела назву «Дзяцінства, апаленае вайною». Да яе была прымеркаваная кніжная выстаўка, дзе прадстаўленыя ўспаміны відавочцаў падзеяў Вялікай Айчыннай вайны ў Полацкім раёне, у тым ліку і ўспаміны тагачасных падлеткаў, а таксама падборка вершаў пра вайну Д. Пугачэўскай, кнігі з серыі «Дзеці вайны».

Джэма Іванаўна таксама пабачыла вайну дзіцем. Яна нарадзілася і жыла ў Полацку. Калі пачалася вайна, ёй было ўсяго 6 гадоў. Бацька быў вайскоўцам і адразу пайшоў ваяваць. Праводзіць яго на фронт прыйшла на вакзал маленькая дачка. Развітваючыся, бацька сказаў ёй: «Ну, бяжы дадому, дачушка!» Дзяўчынка пабегла дахаты, а дома... няма . На яго месцы вялізная яма. Яна кінулася туды, бо дома заставаліся мама і маленькі брацік. На шчасце, абое былі жывыя: літаральна за некалькі хвілінаў да таго, як на дом упала бомба, маці з дзіцем выйшла на вуліцу, таму і засталіся жывымі.

Так пачалося для іх сям'і чатырохгадовае ліхалецце. Некаторы час жылі ў вёсцы Гузы, на радзіме бацькі. Неўзабаве вёску немцы спалілі, а жыхароў, у тым ліку Джэму з маці і братам, забралі ў Спаскі гарадок у Полацку, у канцлагер, за калючы дрот. «Як я зайздросціла вароне, – прыгадвае Джэма Іванаўна свае пачуцці, – што яна можа ляцець куды захоча, нават за дрот, прэч ад аўчарак, якія бегалі па перыметры лагера і страшна брахалі. Гэты страх сабачага брэху настолькі ўсяліўся ў мяне, што нават цяпер, праз столькі гадоў, не магу бачыць нават маленькіх сабачанят». Калі сям'ю адпусцілі з лагера, яны жылі ў пасёлку Боркавічы ў родзічаў. Насупраць іх хаты размяшчалася камендатура, адкуль дзень і ноч даносіліся крыкі, стогны людзей, якіх катавалі фашысты. Там жа быў замучаны і дзядзька Джэмы Іван.

Потым было жыццё ў партызанскай зоне. Маці Джэмы Ганна Гузава была партызанкай атрада «Смерць фашызму» брыгады імя Варашылава. Добра памятае і прарыў блакады.

Калі крывавую даліну
Світанак ранкам азарыў,
Начы жахлівую карціну
Праўдзіва сонцу ён адкрыў.
І неба ўздрыгнула цвердзю:
Зямля ў слязах, ў крыві людзей,
Палі, засеяныя смерцю, –
Як апагей ратных падзей.

(Тут і далей пераклад з рускай мовы В. Сопікавай)

Выжылі цудам, выратаваліся. Нарэшце вызваленне Беларусі. Як яны радаваліся салдатам з чырвонымі зоркамі на пілотках! Нашыя! Выгналі фашыстаў!

Пра ўсё гэта расказала Джэма Іванаўна школьнікам. Затаіўшы дыханне, вельмі ўважліва слухалі дзеці аповед сведкі падзеяў тых страшных гадоў. Д. Пугачэўская зачытвала ўрыўкі са сваёй паэмы «Памяць параненага дзяцінства» і каментавала іх. Сваім творам яна данесла да вучняў усё, что перажыла асабіста. Жахі вайны, гераізм барацьбы і гераізм выжывання паказаныя аўтаркай праўдзіва і вобразна. Раздзелы паэмы па храналогіі адпавядаюць падзеям Вялікай Айчыннай вайны: «Чорны гарызонт», «Мой горад», «Не плачуць дзеці на вайне», «Хвароб няма на вайне», «Канцлагер у Спаскім», «Боркавіцкае падполле», «Сярод лясоў і партызан», «Прарыў», «І зноўку плен», «Вызваленне», «Добры дзень, Полацк», «Не трэба болей нам вайны».

У кожным ўздыху лесу, поля
Пакуты мне зямлі чуваць,
І як яна народы моліць:
«Не трэба болей ваяваць!» –

такімі радкамі заканчвае аўтарка паэму.

Таксама Джэма Іванаўна адказвала на шматлікія пытанні дзяцей. Напрыклад, ім вельмі было цікава ведаць, як вучыліся дзеці ў вайну, у партызанскай зоне. Д. Пугачэўская патлумачыла, што вучыліся дзе прыдзецца: то пад навесам, а то і проста на палянцы праводзіліся заняткі. Настаўнік пісаў на пяску літары, а дзеці іх паўтаралі, пісалі на адваротным баку нямецкіх лістовак чарнілами, зробленымі з крушыны. Распавяла і пра тое, як доўгімі зімовымі вечарамі дарослыя пры лучыне чыталі дзецям казкі Пушкіна – адзіную кнігу, якую нехта збярог і ўзяў з сабою ў лес. Нават самыя маленькія вывучылі яе на памяць, але ўсё роўна прасілі зноў і зноў чытаць уголас.

Прагучалі пад час сустрэчы вершы Д. Пугачэўскай пра вайну, падрыхтаваныя навучэнцамі аб'яднання. Дзеці і педагогі былі вельмі ўдзячныя паэтцы за эмацыйную, цікавую, спазнавальную гутарку.

Валянціна СОПІКАВА,
педагог дадатковай адукацыі
Палаца дзяцей і моладзі
г. Наваполацка

«Экавясна і маладосць» у Палацы Рэспублікі

Сталічны ўніверсітэт культуры і мастацтваў з 29 красавіка па 1 мая правёў юбілейную – X Міжнародную навуковую канферэнцыю «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання». Акрамя традыцыйных імпрэзаў канферэнцыі – навуковых пасяджэнняў, этнаграфічнага канцэрта носьбітаў традыцыяў «Фальклор беларускай глыбінкі», вечарыны побытавага танца і дударскай музыкі «Фолк прайм», мастацкай рэканструкцыі свята (сёлета гэта быў Вялікдзень) у музеі-скансэне ў вёсцы Азярцо – у праграме канферэнцыі ўпершыню з'явілася новая. Гэта выстаўка акварэльнага і інтэр'ернага жывапісу, аб'яднаная з прэзентацыяй этнаграфічнага фільма ў галерэі «Універсітэт культуры» Палаца Рэспублікі.

З 2007 года, калі ўніверсітэт заклаў традыцыю правядзення веснавога навуковага форуму, прысвечанага ахове і пераемнасці народнай культуры, яго ўдзельнікі заклікалі да паслядоўнага вывучэння ўсіх бакоў аўтэнтычнага фальклору і ўсіх магчымых шляхоў яго адаптацыі да сучаснасці. Дзесяцігадовы досвед канферэнцыі сведчыць, што такі падыход меў рацыю і пачынае прыносіць плён. У Беларусі найбольш «сенсітыўныя» (пачуццёвыя. – **«КГ»**) і «паглыбленыя ў аўтэнтыку» даследчыкі напрыканцы XX стагоддзя адчулі і аб'ектыўную неабходнасць «звароту да каранёў», і абмежаванасць «вузкадысцыплінарнага» падыходу да этнакультуры. Пра гэта неаднаразова пісалі, напрыклад, філосафы Уладзімір Конан і Мікола Крукоўскі, якія мелі шмат сяброў і аднадумцаў у асяродку спецыялістаў па фальклоры. Дзякуючы інтуіцыі і пасіянарным намаганням айчыннай народазнаўчай навуковай супольнасці, беларусы маюць, напрыклад, выдатныя нізкі гратэскна-эпічных антрапалагічных фільмаў Зінаіды Мажэйкі, якая пачынала як этнамузыколаг, і дакументальна-навелістычных фільмаў Рэгіны Гамзовіч, якая пачынала як журналіст. Сінхронна-рэгіянальны кампаратыўны «зрэз» аўтэнтычнага фальклору краіны міленіуму занатаваны ў шматтомным фальклорным зборы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», аўтарскі калектыў якога на чале з вучаніцай З. Мажэйкі Тамарай Варфаламеевай, філолагам Аленай Боганевай і этнахарэолагам Міколам Козенкам атрымаў за сваю працу спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Падобныя тэндэнцыі па сінтэтычнасці і шматбакоўсці падыходу да фальклорнай спадчыны характэрныя і для суседніх краінаў. Пра ўсё гэта было паслядоўна дакладзена на пленарным і секцыйным пасяджэннях канферэнцыі з удзелам такіх выбітных даследчыкаў, як этнамузыколаг Т. Варфаламеева (Беларусь), этнаарганолаг Богдан Матлаўскі (Польшча), акадэмік Ігар Маціеўскі (Расія), культуролаг Вітаўтас Лукшас (Літва), мастацтвазнаўца і музыка-віртуоз Руслан Кайшыбаеў (Казахстан).


Браты Арцюховы

Адпрацаваная за 10 гадоў форма правядзення канферэнцыі (дзе навукоўцы ўзаемазваротна кантактуюць і з носьбітамі, і з пераемнікамі традыцыі, якія, у свой час, таксама ўзаемадзейнічаюць паміжсобку) «пакрывае» значную плашчыню сацыякультурнай практыкі, накіраванай на ахову і папулярызацыю фальклору ў XXI стагоддзі. На этнаграфічных канцэртах аўтэнтычныя гурты ўсіх рэгіёнаў Беларусі маюць магчымасць паказаць сваё мастацтва. У рамках пост-фальклорных канцэртаў, што звычайна праводзяцца на канферэнцыі ў фармаце вечарынаў побытавага танца і дударскай музыкі, упершыню заяўляе пра сябе шмат фальклорнай моладзі краіны, якая працягвае традыцыі носьбітаў карэннага мастацтва Беларусі. Майстар-класы ў межах канферэнцыі акцэнтуюць увагу на актуальныя формы і метады працы з фальклорнай спадчынай.

Рэгіна Гамзовіч

Пад час інавацыйнай для фармату канферэнцыі імпрэзы «Экавясна і маладосць», што адбылася ў галерэі «Універсітэт культуры», трохмернае «жывое» выкананне традыцыйных найгрышаў капэлай беларускіх народных інструментаў са студэнтаў БДУКМ была аб'яднаная адзіным перформансам з двухмернай рэчаіснасцю антрапалагічнага фільма паводле сцэнарыя Р. Гамзовіч («Абрад Чырачка, альбо як у Тонежы вясну гукаюць») і з выстаўкай акварэльнага жывапісу братоў Арцюховых паводле фальклорных матываў. Тэмы фільма і выстаўкі «перакрыжаваліся» (сярод карцінаў – партрэт антраполага З. Мажэйкі, якая дзесяцігоддзямі даследавала Тонеж і яго абрад Чырачка), шмат візуальных сюжэтаў і музычных сугуччаў аднолькавага напрамку «пераходзілі» з вадкакрышталічнага экрана на аркушы акварэляў і на жывое мастацтва маладых музыкаў і потым – наадварот... Менавіта гэта дало магчымасць наведнікам адчуць і прыгажосць, і жыццёвую сілу этнічнага мастацтва беларусаў, яго этнаэкалагічнасць і ўкаранёнасць у структуры паўсядзённасці жыцця нашага народа. Падаецца, мы прысутнічалі пры нараджэнні новай сінкрэтычнай формы папулярызацыі фальклору і яго самасцвярджэння ў наш час.



Пра тое, што этнічнае мастацтва застаецца актуальным у XXI стагоддзі, сведчыць і статыстыка: у канферэнцыі 2016 года ўдзельнічалі 110 даследчыкаў з 10 краінаў (Беларусь, Расія, Украіна, Польшча, Літва, Латвія, Бельгія, Малдова, Казахстан, Кітай), з іх – 6 дактароў навук і 20 кандыдатаў навук, шмат маладых даследчыкаў. За хадою падрыхтоўкі і правядзеннем канферэнцыі можна была сачыць на афіцыйным сайце ўніверсітэта buk.by.

Энгельс ДАРАШЭВІЧ,
доктар філасофскіх навук,
прафесар БДУКМ
Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Славутыя аднагодкі

Нядаўна ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь адкрылася выстаўка «Славутыя імёны ў гісторыі Беларусі: Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі, Іван Іванавіч Луцкевіч». Экспазіцыя прымеркаваная да 135-годдзя з дня нараджэння гэтых выбітных асобаў, прадстаўленыя на ёй матэрыялы расказваюць пра іх жыццё і дзейнасць.

Усевалад Ігнатоўскі рупліва працаваў на ніве беларускай навукі, яго творчая спадчына налічвае больш за 30 грунтоўных працаў. На экспазіцыі прадстаўленыя прыжыццёвыя выданні аўтара, сярод іх манаграфія «1863 год на Беларусі» (1930), «Матывы лірыкі беларускага песняра М. Чарота» (1922), «Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця» (1925), публікацыі ў перыядычным друку.

Таксама на выстаўцы прадстаўлены «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» (4-е выд., перапрац., 1925), дзе У. Ігнатоўскі зрабіў спробу перыядызацыі гісторыі Беларусі. Кніга вытрымала некалькі перавыданняў і сёння з'яўляецца аўтарытэтнай крыніцай для навукоўцаў. Усевалад Макаравіч стаяў каля вытокаў стварэння Навукова-тэрміналагічнай камісіі, пазней рэарганізаванай у Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), які ён узначальваў з 1926 па 1928 г. Са снежня 1928 г. Ігнатоўскі – кіраўнік Акадэміі навук. Пазней трапіў пад рэпрэсіі, быў абвінавачаны ў контрэвалюцыйнай барацьбе. Жыццё У. Ігнатоўскага трагічна абарвалася ў лютым 1931 г. Рэабілітаваны ён быў толькі ў 1990-я гг.

Іван Луцкевіч быў ініцыятарам заснавання ў Вільні першай легальнай беларускай газеты «Наша доля» (1906), тыднёвіка «Наша Ніва» (1906 – 1915), на старонках якога пачыналі свой творчы шлях Максім Багдановіч, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі, Змітрок Бядуля і іншыя аўтары. Агульнымі намаганнямі І. Луцкевіча і Цёткі ў 1915 г. былі створаныя нацыянальныя настаўніцкія курсы і адчыненыя першыя беларускія пачатковыя школы. І. Луцкевіч стаяў каля вытокаў стварэння першай беларускай гімназіі ў Вільні, дзе ён выкладаў краязнаўства і беларусазнаўства. У 1919 – 1944 гг. у гімназіі працавалі Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Рыгор Шырма і інш.

Багатая калекцыя кніг і старажытнасцяў І. Луцкевіча стала асновай для стварэння першага беларускага нацыянальнага музея. У калекцыі былі ўнікальныя экспанаты: сыгнеты (пярсцёнкі з пячаткай) полацкіх князёў Усяслава і Барыса, рукапісныя кнігі XIV ст. і старадрукі ад XV ст., Статут ВКЛ (1588), прадметы з археалагічных раскопак, багатая калекцыя слуцкіх паясоў, шмат экспанатаў па беларускай этнаграфіі. У пачатку 1918 г. І. Луцкевіч перадаў свае калекцыі Беларускаму навуковаму таварыству ў Вільні.

Шматгранная спадчына І. Луцкевіча доўгі час была мала вядомай. Толькі ў 1991 г. упершыню шырокім колам грамадства была адзначаная гадавіна яго нараджэння. На экспазіцыі прадстаўленыя даследаванні сучасных аўтараў па гэтай тэме.

Выстаўка «Славутыя імёны ў гісторыі Беларусі: Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі, Іван Іванавіч Луцкевіч» дае магчымасць не толькі яшчэ раз ўзгадаць вядомыя імёны, але і пераасэнсаваць дзейнасць нашых суайчыннікаў у гістарычным кантэксце. Наведаць выстаўку можна да 15 чэрвеня.

Святлана ПАЎЛАВІЦКАЯ,
супрацоўнік адзела старадрукаў і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь

Фота Юліі СЯРМЯЖКІ

Генерал-лейтэнант Мікалай Трыкоўскі

(Заканчэнне. Пачатак у № 19)

Але ўдзел М. Трыкоўскага ў нацыянальным руху быў кароткачасовым. У далейшым ён трывала звязаў лёс з Чырвонай Арміяй. Тут неабходна зрабіць тлумачэнне. Большасць генералаў і афіцэраў не мелі асаблівых сімпатыяў да Савецкай улады. Разам з тым, яны не жадалі ўдзельнічаць у братазабойчай грамадзянскай вайне і нейкі час стараліся захоўваць нейтралітэт. Сітуацыя змянілася з пачаткам нямецкага наступлення ў лютым 1918 г., калі Камітэт рэвалюцыйнай абароны Петраграда выдаў зварот «Да ўсіх кадравых афіцэраў», дзе заклікаў дапамагчы ў фармаванні «рабочых атрадаў для паспяховай абароны» ад знешняга ворага. На яго адгукнуліся тысячы вайскоўцаў, сярод іх быў і М. Трыкоўскі. 54-гадовы генерал, адзначаны дзевяццю ордэнамі і залатой зброяй, заняў невысокую для свайго чына пасаду – ваеннага кіраўніка Стара-Рускага чырвонаармейскага атрада. Неўзабаве ён стаў галоўным кіраўніком (так названая пасада ў «Краткой записке...») Цвярскога ваеннага атрада, пазней перафармаванага ў 3-ю Маскоўскую дывізію, які рыхтаваў папаўненне для Усходняга фронту. У верасні 1918 г. ваенспец Трыкоўскі з-за хваробы быў звольнены са службы.

У гэты час – разрухі, голаду і грамадзянскай вайны – ён стаў загадчыкам Цвярской цэнтральнай публічнай бібліятэкі. Паводле ўспамінаў яе супрацоўнікаў: *«Чалавек ён быў цудоўны! Запальчывы, але па-сапраўднаму добры, які хутка адыходзіў... працаваў добрасумленна і нават рашуча, але апалітычна»*. Колішні камандзір корпуса здолеў наладзіць ацяпленне бібліятэкі, арганізаваў пераплётную майстэрню і сам займаўся класіфікацыяй кніг. А яшчэ ён быў... старшынёй агароднай камісіі і дабіваўся для сваіх падначаленых лепшых участкаў на камунальных агародах.

М. Трыкоўскі ў папасе, з кійком

«Бібліятэчны» перыяд працягваўся каля года. А потым – вяртанне ў армейскія шэрагі. 1919 г. – выкладчык тактыкі ў Маскоўскай акружной школе дапрызыўнікоў (г. Цвер); з 1920 г. – выкладчык тактыкі ў 9-й Цвярской кавалерыйскай школе; з лістапада 1923 г. – выкладчык Вышэйшай тактыка-стралковай школы па методыцы навучання і выхавання войскаў. Увесь час Мікалай Сямёнавіч знаходзіўся на штабной і выкладчыцкай працы, у баях не ўдзельнічаў. Магчыма, таму і не атрымаў ад Савецкай улады ўзнагародаў. І ўсё ж, думаецца, зрабіў немалы ўнёсак у станаўленне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Вось вытрымкі з яго атэстацыі за 1925 г.: *«...один из весьма немногих [преподавателей] знающих предмет в целом и умеющих его передать. Человек талантливый, энергичный и решительный. С большой инициативой и незаурядным умом. Имеет большой боевой, строевой и педагогический опыт. Несмотря на свои 60 лет не устарел ни по навыкам, ни по понятиям. Человек с твёрдым характером и волей. Хорошо знает педагогику и методику... Пользуется безусловным и непререкаемым авторитетом, как среди преподавателей и слушателей в школе, так и за стенами школы. Много работает над своим предметом, много пишет, владеет бойким и разумным пером...»*. У гэты час М. Трыкоўскі ўваходзіў у склад рэдкалегіі спецыялізаванага ваеннага часопіса «Выстрел». Выдаў кнігі «Боевая подготовка одиночного бойца и звена» (1924), «Методика полевой подготовки стрелкового взвода» (1926).

Выснова атэстацыі гучыць наступным чынам: *«Дело своё знает отлично. Не вполне освоился с идеологией Красной Армии, что иногда прорывается на его занятиях со слушателями. Как высоко квалифицированного работника оставить на занимаемой должности»*. Гэта напісана 10 чэрвеня 1925 г. А 16 сакавіка 1926 г. штатны выкладчык методыкі курсаў удасканалення каманднага складу М. Трыкоўскі быў выключаны са спіскаў Чырвонай Арміі ў сувязі «са смерцю». Падрыхтаваныя ім кнігі працягвалі выходзіць. У 1927 г. убачыў свет дапаможнік «Боевой порядок роты под огнём», у 1930 г. – падручнік «Тактика пехоты».

Пахаваны генерал-беларус у Маскве на Новадзявочых могілках побач з жонкай Марынай Сцяпанаўнай. Звестак пра яго нашчадкаў няма. Нічога невядома і пра малодшага брата Уладзіміра Трыкоўскага. Магчыма, далейшыя пошукі дазволяць вярнуць яшчэ адно імя.

Андрэй БЛІНЕЦ,
г. Клецк

Патрыярх гродзенскага краязнаўства

У Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф. Карскага адбылася прэзентацыя новай кнігі Аляксея Пяткевіча «Слова і кніга Прынёмання». Яе аўтар – беларускі літаратуразнаўца, крытык, культуролаг, краязнаўца, педагог. Мы ганарымся, што Аляксей Міхайлавіч з'яўляецца даўнім сябрам нашай бібліятэкі, а чытачом – з 1957 года. Чалавек з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, інтэлігент найвышэйшай пробы – гэтыя якасці заўсёды вылучалі і вылучаюць яго. Таму не дзіўна, што прэзентацыя кнігі адбылася ў межах творчага праекта «Яны ўзбагацілі культуру Гродзеншчыны», ініцыяванага нашай бібліятэкай, і акурат у дзень 85-годдзя аўтара.



А. Пяткевіч

Выданне «Слова і кніга Прынёмання» – гэта зборнік навуковых артыкулаў аб станаўленні і развіцці рукапіснага пісьменства, друку і літаратуры на гарадзенскіх землях. На старонках кнігі аўтар адлюстраваў гісторыю друку на Гродзеншчыне ў XVII – XVIII стст., у міжваенны перыяд. Аўтар прадставіў звесткі больш чым пра 600 творчых асобаў – літаратараў і журналістаў. Дакладныя і змястоўныя характарыстыкі герояў прыцягваюць увагу да знаёмых і незнаёмых прозвішчаў беларускай літаратуры і друку, і не толькі беларускай! Новая кніга змяшчае інфармацыю пра ўсіх пісьменнікаў, творчыя і жыццёвыя пуцявіны якіх знітаваныя з Прынёманнем: польскамоўных, рускамоўных і творцаў на ідыш.

Павіншаваць Аляксея Міхайлавіча з новай кнігай і з юбілеем сабралася вялікае кола навукоўцаў, творцаў, дзеячаў культуры і мастацтва. Першымі чытачамі новай кнігі сталі беларускія літаратуразнаўцы Ігар Жук, Ала Петрушкевіч, Святлана Тарасава, якія раскрылі навуковы падыход і грунтоўнасць выдання для вывучэння гісторыі культуры рэгіёна. А. Петрушкевіч падкрэсліла фундаментальнасць новага выдання і назвала яго «энцыклапедыяй літаратурнага, культурнага жыцця Гродзеншчыны». Чырвонай ніткай у выступленні І. Жука, прафесара Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, прайшла думка аб тым, што «кожная кніга Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча – адкрыццё». С. Тарасава адзначыла, што для аўтара кнігі характэрнае валоданне словам і адчуванне чужога слова.

Нарадзіўся А. Пяткевіч у мястэчку Новы Свержань на Стаўбцоўшчыне. Роднаму мястэчку Аляксей Міхайлавіч прысвяціў эсэ «Бацька мой Нёман» – споведзь пра родны кут, пра сваю сям'ю. Бацька Міхаіл Антонавіч паходзіў з сям'і дробнага службоўца на чыгунцы, маці Антаніна Уладзіміраўна – з сям'і рамесніка. Зарабляць на хлеб з малых гадоў даводзілася і дзецям, Алёшу таксама не абмінуў наканаваны многім незаможным местачкоўцам лёс пастушка. Менавіта ў такіх звычайных сем'ях растуць працавітыя дзеці, якія з ранняга дзяцінства ведаюць, што ў жыцці трэба разлічваць у першую чаргу на ўласныя сілы. У Новым Свержані Аляксей адразу ж паступіў у другі клас

А. Петрушкевіч

польскай сямігодкі, бо чытаць і пісаць па-беларуску і па-польску навучыўся самастойна.

У нарысе «З пройдзенага» Аляксей Міхайлавіч пісаў: *«У 1957 годзе я трапіў у Гродна. З тае пары прайшло, па сутнасці, цэлае жыццё ў горадзе над Нёманам. Я тут не проста прыжыўся. Я стаў гродзенцам, для якога кожная драбніца старых вуліц і вулачак, унікальных помнікаў архітэктуры, старажытных каштанаў і ліпаў значная і дарагая».*

Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і аспірантуры пры ім, пасля прэстыжнага размеркавання – у Інстытут літаратуры Акадэміі навук – Аляксей Міхайлавіч адмаўляецца ад надзейнай навуковай кар'еры і едзе чытаць лекцыі студэнтам ў Гродзенскім педінстытуце. Працы там яму далі ўдосталь: лекцыі, практычныя заняткі, педагагічная практыка. Працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры літаратуры, з 1968 года ўзначальваў кафедру беларускай літаратуры. Аляксей Міхайлавіч быў ініцыятарам стварэння пры ўніверсітэце першай у краіне кафедры беларускай культуры, дзе спачатку працаваў дацэнтам, а потым і ўзначаліў яе. З 2006 года – працаваў на кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму, якая з 2013 года стала кафедрай турызму і культурнай спадчыны.

У 1994 годзе А. Пяткевіч стаў прафесарам. Перад гэтым яго навуковыя працы праходзілі экспертызу ў Інстытуце сусветнай літаратуры імя Максіма Горкага, Аляксей Міхайлавіч чытаў адкрытую лекцыю ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Прафесар Пяткевіч – фігура аўтарытэтная сярод калегаў і студэнтаў не толькі Гродзенскага ўніверсітэта, але і іншых універсітэтаў Беларусі і суседніх краінаў.

Першая літаратуразнаўчая публікацыя Аляксея Міхайлавіча з'явілася ў 1958 годзе – у часопісе «Полымя» быў змешчаны артыкул «Майстэрства партрэтнай характарыстыкі». У Саюз пісьменнікаў СССР А. Пяткевіч быў прыняты па рэкамендацыях Васіля Быкава і Дануты Бічэль у 1971 годзе як крытык і літаратуразнаўца. У яго навуковым багажы – 8 асобных кніг, 5 кніг у суаўтарстве, больш за паўтысячы артыкулаў. Якраз у Гродне А. Пяткевіч напісаў першую кнігу пра творчыя здабыткі Кузьмы Чорнага, а яшчэ раней абараніў па гэтай тэме кандыдацкую дысертацыю.

Зямлі, якая стала другой Радзімай, Аляксей Міхайлавіч прысвяціў даведнік «Людзі культуры з Гродзеншчыны», падобных якому ў іншых рэгіёнах няма. У ім аўтар раскрыў біяграфіі каля 600 ураджэнцаў рэгіёна – мастакоў, пісьменнікаў, архітэктараў, вучоных-гуманітарыяў. Што адметна, пра многіх людзей, згаданых у гэтай кнізе, маўчаць нават энцыклапедыі. Акрамя гэтага выдання было яшчэ адно краязнаўчае даследаванне – «Літаратурная Гродзеншчына: Мясціны. Людзі. Кнігі», якое выйшла ў 2000 годзе. Грамадская і нацыянальная руплівасць вывела вучонага на ніву літаратурнага краязнаўства. Можна ўзгадаць яшчэ два выданні: «Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне» (2002) і «Старонкі спадчыны. Культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы» (2006).

Нельга не адзначыць плённае супрацоўніцтва прафесара з выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» і яго ўдзел ў падрыхтоўцы і выданні гістарычных раённых хронікаў «Памяць». Варта падкрэсліць: хто б і якім аспектам у вывучэнні культуры, літаратуры і мастацтва Гродзеншчыны, ды і ўвогуле гродзенскай рэгіяналістыкі, ні займаўся, без кніг А. Пяткевіча не абысціся. Супрацоўнікі нашай бібліятэкі ганарацца, што яго выданні захоўваюцца і выкарыстоўваюцца ў бібліятэках не толькі нашай краіны, але і Масквы, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Любліна, Кракава.

Аляксей Міхайлавіч заўсёды ў віры культурна-грамадскага жыцця. Ён узначальвае гарадское аддзяленне Таварыства беларускай мовы. Шаснаццаць гадоў на гродзенскай студыі тэлебачання рыхтаваў і вёў штомесячную праграму «Кнігарня». А. Пяткевіч – пастаянны ўдзельнік шматлікіх навуковых і культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў як у нашым рэгіёне, так і на ўзроўні краіны. Мы ганарымся тым, што знаны даследчык удзельнічае ў Гродзенскіх навуковых чытаннях.

Сутнасць асобы Аляксея Міхайлавіча вельмі дакладна раскрываюць радкі з верша Ларысы Геніюш:

Адзінай мэты не зракуся,
І сэрца мне не задрыжыць:
Як жыць –
дык жыць для Беларусі.
А без яе зусім не жыць.

Любоў ТУРМАСАВА,
загадчык аддзела краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага

Фота бібліятэкара аддзела краязнаўства Тамары ДАРАШКЕВІЧ

Яны ішлі поруч

11 мая ў дзень нараджэння Янкі Маўра ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя кніг «Янка Маўр. Выбранае» і «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа» – малодшай дачкі Янкі Маўра, нявесткі Якуба Коласа Наталлі Міцкевіч.

У першую кнігу, выдадзеную у серыі «Беларускі кнігазбор», увайшлі аповесці Янкі Маўра, некалькі апавяданняў, артыкулаў, эпісталярная спадчына Я. Маўра – лісты да Якуба Коласа, Алеся Якімовіча і іншых. У дадатку прыведзеныя ўспаміны пра Янку Маўра і вершы, прысвечаныя беларускаму дзіцячаму пісьменніку. Некаторыя лісты і артыкулы з цыкла «Старонкі гісторыі» друкуюцца ўпершыню.

Укладальнікам кнігі стала ўнучка Янкі Маўра і Якуба Коласа – Марыя Міцкевіч, а кароткую прадмову да кнігі напісала яе дачка – Васіліна Міцкевіч.

У другую кнігу, якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда», увайшлі ўспаміны дачкі Янкі Маўра Н. Міцкевіч. У кнізе апісаныя раней невядомыя факты жыцця Янкі Маўра, раскрытыя яго ўзаемаадносіны з роднымі, знаёмымі. Аўтарка кнігі яскрава перадае цяжкасці эвакуацыі ў часе Другой сусветнай вайны, складанае становішча сям'і пісьменніка ў Алма-Аце.

Да прэзентацыі падрыхтаваная невялікая фотавыстаўка з асабістага архіва сына Якуба Коласа і зяця Янкі Маўра – Міхася Міцкевіча, якую ён сам прадставіў.

Акрамя таго, да імпрэзы адбылося адкрыццё кніжна-дакументальнай выставы «Літаратурныя шляхі Якуба Коласа і Янкі Маўра», прысвечанай двум асобам у нацыянальнай культуры. Супрацоўнікі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі пазнаёмілі з найбольш цікавымі дакументамі з рукапіснага фонду: рукапісамі твораў Янкі Маўра, фотаздымкамі, кнігамі Якуба Коласа з дарчымі надпісамі.

На прэзентацыі прысутнічалі і выступілі літаратары і выдаўцы М. Мятліцкі, Г. Далідовіч, Г. Кісялёў, У. Шулякоўскі і інш.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Апошняя кніга Барыса Сачанкі

У выдавецтве «Кнігазбор» выйшла пасмяротная кніга Барыса Сачанкі «Пад сузор'ем сярпа і молата» (бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»). 15 мая вядомаму пісьменніку споўнілася б 80 гадоў з дня нараджэння.

Нячаста здараецца такое, што пасля смерці прыкметнага аўтара праходзяць дзясяткі гадоў, і раптам аб'яўляецца яго невядомая кніга. Тым не менш, з празаікам, гісторыкам, галоўным рэдактарам «Беларускай Энцыклапедыі» Б. Сачанкам здарылася менавіта так: сваю апошнюю кнігу «Пад сузор'ем сярпа і молата» ён паспеў здаць у выдавецтва «Мастацкая літаратура». Кніга не задумвалася як развітальная, наадварот, пісьменнік быў поўны планаў на будучыню, аднак раптоўная смерць перакрэсліла іх усе. У выдавецтве таксама пачаліся незразумелыя затрымкі з выхадам кніг. Урэшце, праляжаўшы дзесяць гадоў на складзе, рукапіс кнігі вярнуўся ў сям'ю Б. Сачанкі, да ягонай дачкі Галіны.

Кніга змяшчае тэксты, напісаныя Б. Сачанкам у апошнія гады жыцця. Адкрывае зборнік аўтабіяграфічная аповесць «Засталіся толькі ўспаміны…» – пра ваеннае дзяцінства ў вёсцы Вялікі Бор, паўсядзённае



жыццё на акупаванай тэрыторыі, а пасля спаленне вёскі і высылку насельніцтва ў Германію. Асноўная частка кнігі – мемуарныя нататкі і літаратурныя запісы з часоў працы Б. Сачанкі ў рэдакцыі часопіса «Полымя» (1960 – 1976), згадкі пра выдатных пісьменнікаў і цяжкі ход рэбілітацыі рэпрэсаваных, які распачаўся пасля XX з'езда КПСС і выкрыцця культу асобы Сталіна.

Адной з грунтоўна прапрацаваных Сачанкам тэмаў была літаратура паваеннай беларускай эміграцыі – ёй у апошняй кнізе пісьменніка прысвечана шмат старонак з публікацыяй малавядомых фактаў біяграфіі ўдзельнікаў літаратурнага руху ў выгнанні, іх лістоў і нават некаторых твораў. Разам з архіўнай дзейнасцю Б. Сачанка быў вядомы як зацяты бібліяфіл, і аповеды пра здабыццё рэдкіх беларускіх выданняў дадуць нямала асалоды сучасным збіральнікам кніг.

Артыкулы, эсэ, дзённікавыя запісы, мініяцюры Б. Сачанкі, сабраныя ў кнізе «Пад сузор'ем сярпа і молата», друкаваліся ў часопісах «Крыніца», «Полымя», штотыднёвіку «ЛіМ». На той бурлівы час пачатку 1990-х яны былі надзвычай прыкметныя, бо змяшчалі невядомыя факты з беларускай гісторыі, у тым ліку і перш за ўсё – гісторыі беларускай літаратуры. З упэўненасцю можна сказаць, што гэтыя факты і цяпер недастаткова засвоеныя і ўсім даступныя. Архівы сталінскага тэрору зноў надоўга закрыліся, эміграцыйная літаратура па-ранейшаму не выдаецца дзяржавай, а таму чытанне апошняй, насычанай фактамі, кнігі Б. Сачанкі прынясе немалую карысць і даследчыку-літаратуразнаўцу, і гісторыку, і ўрэшце кожнаму, хто цікавіцца літаратурай.

Зборнік Б. Сачанкі можна набыць у сталічных кнігарнях.

Браты: Іван, Пятро, Барыс, Алесь Сачанкі

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Гісторыя песні

«Цалаваў Алёну Янка над вадой»

Запомніліся ўрокі спеваў у чацвёртым класе пачатковай школы ў вёсцы Латышы Мёрскага раёна. Рэпертуар быў такі: «Броня крепка і танкі нашы быстры», «Дуня-тонкопряха»… У калгасе імя В.І. Чапаева павінны былі спяваць яго: «Гулял по Уралу Чапаев-герой». Першы радок я вывеў нармальна. А вось наступны захрас у горле: «Онсоколомрвалсяспол-камінабой…» Папрасіць настаўніцу патлумачыць такую скорагаворку пабаяўся, бо яна паспела паздзекваца з майго вымаўлення слова «пряха».

Выручыла бабуля Альжбета. Калі яна пачала: «Ды не кукуй жа, зязюленька, рана, я й, маладзенька, усю ночку не спала…», я зразумеў, што песня жыве толькі галоснымі гукамі.

А як іх трэба вымаць са сваіх грудзей і ўкладаць у вершы, падказаў пачаткоўцу Аляксей Пысін. Калі я вучыўся ў Магілёве на фельчара, хадзіў да Аляксея Васільевіча на заняткі ў літаб'яднанне пры газеце «Магілёўская праўда». У 1960-я гады некаторыя паэты любілі пад назвы сваіх твораў ставіць пазначку: «З народнага». А я на чарговых канікулах у суседняй з маімі роднымі Бабышкамі вёсцы Латышы запісаў ад цёці Ядзі (Ядзвігі Антонаўны Сялюн, 1922 года нараджэння) шэсць народных песняў. Адна з іх пачыналася так: «У суботу Янка ехаў ля ракі». Вядома ж, я гэты фальклорны твор «апрацаваў», запісаўшы на аркушы паперы наступнае:

Ручнікі плылі

(З народнага)

У суботу Янка
Ехаў ля ракі.
Напаткаў дзяўчыну –
Мыла ручнікі.
Гаварыў красуні:
– Ужо дзень патух.
Дзе тут пераехаць
На другі мне луг?
– Многа ёсць тут бродаў,
Едзь абы куды.
Не муці мне толькі
Чыстае вады.
У маркоце Янка
Галавой панік…
З рук упаў у рэчку
Беленькі ручнік.
– Янка, мой саколік,
Ходзь сюды хутчэй:
Ой, плыве, знікае
Ручнічок з вачэй.
…Супыніўся гнеды
Пад вярбой густой.
Цалаваў Алену
Янка над вадой.
Над ракой туманы
Сцелюць па зямлі,
А па цёплых хвалях
Ручнікі плылі.

(2 ліпеня 1961 г.)

На чарговым пасяджэнні літаб'яднання Аляксей Васільевіч агледзеў маё чыстапісанне і далікатна папрасіў: «Пакажы сваё…»

Мільгалі месяцы вучобы. Аднаго разу пасля канікулаў наш настаўнік, убачыўшы мяне, уголас пажартаваў:

– Ну, Сяргей! Пра твае ручнікі радыё спявала!

Пазней я даведаўся, што песня «Ручнікі», якую стварылі Вера Вярба і Мікола Пятрэнка, упершыню прагучала ў 1962 годзе ў Лёзне, калі там праходзіла раённая дэкада беларускага мастацтва. Потым песня займела поспех у вобласці і адразу ж загучала на рэспубліканскім радыё.

Заціх я са сваім «прынародным», але калі пачаў рыхтаваць падборку з 148 запісаных мною народных песняў для зборніка «Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні» (кніга выйшла летась у Выдавецкім доме «Беларуская навука»), то зацікавіўся раней апублікаванымі тэкстамі «Ручнікоў» – «Рушнікоў». У «Анталогіі беларускай народнай песні», выдадзенай у 1975 годзе, ёсць тэкст, які падаю тут на заверша майго «верша».

Ручнікі

У суботу Янка ехаў ля ракі,
Пад вярбой Алёна мыла ручнікі.
– Пакажы, Алёна, броды земляку,
Дзе тут пераехаць на кані раку?
– Адчапіся, хлопец, едзь абы-куды,
Не муці мне толькі чыстае вады.
У маркоце Янка галавой панік,
Упусціла дзеўка беленькі ручнік.
– Янка, мой саколік, памажы хутчэй,
Ой, плыве, знікае ручнічок з вачэй.
– Любая Алёна, я вады баюсь,
Пацалуй спачатку,
што як утаплюсь?
Супыніўся гнеды пад вярбой густой.
Цалаваў Алёну Янка над вадой.
Стала ціха, ціха на усёй зямлі,
Па рацэ далёка ручнікі плылі…

У некаторых публікацыях аўтарам тэксту называецца Г. Сокалава, гэта значыць – Гертруда Пятроўна Сакалова (у дзявоцтве Маркава). Вера Вярба ў нас з'явілася ў 1962 годзе, калі ў 20-гадовай паэтэсы выйшаў зборнік «Вочы вясны».

З летуценніцай з Талачынскага раёна, слаўнавядомай Верай Вярбой я ніколі не гаварыў пра мае фальклорныя запісы. А вось з кампазітарам, педагогам, заслужаным настаўнікам Беларусі, ганаровым грамадзянінам Полацка Міколам Пятрэнкам у мяне склаліся ўдалыя творчыя стасункі. Сярод больш як 300 песняў, створаных ім, ёсць мелодыі на мае словы: гэта «Нарачанка», «Голас горада», надрукаваныя ў маім песенніку «Дабравест» (выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2006 год). Аднаго разу я, наіўны чалавек, асцярожна запытаўся ў Міколы Макаравіча, а ці даводзілася яму чуць раней мелодыю, агучаную ў «Ручніках»?

– Не! – катэгарычна выгукнуў кампазітар. – З мяне яна выйшла.

А песню «Ручнікі» Веры Вярбы і Міколы Пятрэнкі справядліва называлі і называюць народнай. Маўленне народа, спрадвечнае гучанне яго струнаў – у аўры нашай існасці. Таму мы ўсе – духоўнае пераствараенне продкаў. Хто з нас вычуйвае іх дыханне, той і надалей будзе спадкаемцам нашай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Міколы Пятрэнкі не стала ў 1997 годзе, а Веры Вярбы – зусім нядаўна, 15 ліпеня 2012 года. Помніцца вясёлая сустрэча з ёй у сакавіку 2004 года на юбілейным святкаванні дня нараджэння кнігазбораўскага тытана Кастуся Цвіркі. Уявіце бераг Скачальскага возера недалёка ад Зялёнай Дубровы Старадарожскага раёна. Каля вогнішча пад вярбой густой бачу Эдуарда Зарыцкага, Анатоля Клышку, Уладзіміра Карызну, Алеся Ставера… Нехта з гасцей да рэчкі Пціч яшчэ не дакрыліў. І прыазёрная сябрына радасна заспявала:

У ахвоце Цвірка ў азярко не знік, –
І яму ўсміхнуўся беленькі ручнік!

Сяргей ПАНІЗЬНІК

На здымках аўтара: Вера Вярба, Мікола Пятрэнка і яго сябра Пётр Пацэй, былы дырэктар Полацкага педвучылішча, 1987 г.

Чэрвень

1 – Багушэвічы (Бярэзінскі раён), вёска, цэнтр сельсавета – 515 гадоў з часу першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах.

1 – Беларускі клуб у Вільні (Вільня; дзейнічаў у 1916 – 1920 гг.) – 100 гадоў з пачатку існавання.

1 – Джордж Браўн (**Броўн**; у манастве Юзаф; 1801 – 1879), гісторык, бібліёграф, педагог, які вывучаў гісторыю ордэна езуітаў у Беларусі і Польшчы, – 215 гадоў з дня нараджэння.

1 – Брэсцкая крэпасць (Брэст; 1836), комплекс абарончых збудаванняў XIX – пачатку XX стст. – 180 гадоў з часу закладкі першага каменя.

1 – Мікола Гваздоў (Мікалай Васільевіч; 1916, Полацкі р-н – 1937), паэт – 100 гадоў з дня нараджэння.

1 – Далідовіч Генрых Вацлававіч (1946, Стаўбцоўскі р-н), пісьменнік, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1987), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1996) – 70 гадоў з дня нараджэння.

1 – Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка» (Клімавічы; 1996), штогадовы конкурс для таленавітых дзяцей 9 – 16 гадоў – 20 гадоў з пачатку правядзення.

1 – Міско Якуб Герасімавіч (1911, Слонімскі р-н – 1981), пісьменнік, журналіст, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння.

1 – «Могилёвский вестник» (Магілёў; выдавалася з 01.06.1906 да 28.04.1917 г.), штодзённая грамадска-палітычная і літаратурная газета праваакцябрысцкага кірунку – 110 гадоў з пачатку выдання.

1 – Мсціслаў Уладзіміравіч (у хрышчэнні **Фёдар**; 1076 – 1132), вялікі князь кіеўскі, правіў Наўгародскай зямлёй, ваяваў з Полацкім княствам, святы Рускай Праваслаўнай Царквы – 940 гадоў з дня нараджэння.

3 – Даўгяла Міхаіл Сцяпанавіч (1956, Бешанковіцкі р-н), вучоны-гісторык, аўтар працаў па гісторыі славянскіх краінаў, іх экалагічных праблемах, методыцы выкладання гісторыі – 60 гадоў з дня нараджэння.

3 – Алесь Дзятлаў (**Аляксандр Мікалаевіч**; 1936, Бабруйскі р-н), пісьменнік, аўтар аповесцяў і апавяданняў, нарысаў, фельетонаў, твораў для дзяцей – 80 гадоў з дня нараджэння.

3 – Караваева Тамара Георгіеўна (1916, Расія – 1997), балерына, заслужаная артыстка Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

3 – Клюкоўскі Фелікс Людвік Фабіянавіч (1841, Ляхавіцкі р-н – 1863), удзельнік паўстання 1863 – 1864 гг. у Беларусі – 175 гадоў з дня нараджэння.

4 – Бржазоўская Людміла Генрыхаўна (1946, Мінск), балерына, педагог, народная артыстка Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

4 – Аляксандр Хадкевіч (1776, Украіна – 1838), палітычны і ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік паўстання 1794 г. і вайны 1812 г., вучоны-хімік, член Пецярбургскай АН, літаратар, тэатральны крытык, калекцыянер – 240 гадоў з дня нараджэння.

5 – Будзіловіч Антон Сямёнавіч (1846, Гродзенскі р-н – 1908), гісторык, філолаг-славіст, публіцыст, педагог, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН – 170 гадоў з дня нараджэння.

6 – Эліза Ажэшка (дзяв. **Паўлоўская**; 1841, Гродзенскі р-н – 1910), пісьменніца, аўтар мастацкіх твораў, публіцыстычных і літаратурна-крытычных працаў, перакладзеных на многія еўрапейскія мовы, імем якой названая адна з цэнтральных вуліцаў Гродна, – 175 гадоў з дня нараджэння.

6 – Пятровіч Генадзь Уладзіміравіч (1926, Капыльскі р-н – 2003), артыст оперы, заслужаны артыст Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

6 – Раманенка Зінаіда Іосіфаўна (1911, Украіна — ?), педагог, дзеяч самадзейнага мастацтва, заслужаная настаўніца Беларусі, узнагароджаная ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» – 105 гадоў з дня нараджэння.

Засцілай сталы і лавы!

Уздоўж

1. «А свежая рыбачка – акунёк, а любімы ... – мой кумок». З беларускай народнай песні «Кума». **4.** ... мурлыча – гасцей кліча (прык.). **6.** «Была ў іх гушча і ..., // І парасяціна смажона». З паэмы «Энеіда навыварат». **7.** ... гасцямі багата (прык.). **9.** Гаспадар – за гарэлачку, а ... – за талерачку (прык.). **11.** Госць першы дзень – ..., другі дзень – срэбра, на трэці – медзь і дадому едзь (прык.). **13.** Паралелаграм. **14.** У некаторых краінах назва парламента. **16.** ... б'юцца – да гасцей (прык.). **17.** Гасцям – ..., а коням – стоўб (прык.). **18.** Палявая кветка. **20.** Вячэрняя гулянка з музыкай і танцамі. **24.** «Засцілай, ..., сталы і лавы, // Бо да нас едзе госць небывалы». З беларускай народнай песні «Ой, у садочку цвіла лілея». **25.** У сваёй хаце і ... маці (прык.). **27.** Таму добра ў гасцях, каму ... сумна (прык.). 28. Сёння тут, а заўтра ў другі ... (прык.). **29.** Лесаматэрыялы.

Упоперак

2. «Нашы хлопцы хварсуны, // На сямёх адны штаны. // У ... збіраюцца, // За штаны ругаюцца» (прып.). **3.** Гумовы ці скураны абутак у выглядзе галёшаў. **5.** Дарога, шлях. **6.** Адна ралля – ... сярпы, дзве раллі – тры сярпы (прык.). **7.** Вялікае памяшканне для адпачынку, чакання. **8.** Рэшткі недагарэлай свечкі. **10.** Невялікая сякера. **12.** Дадатковы тон, які надае асноўнаму гуку тэмбр. **15.** Невялічкая малпа. **18.** Акцёр, выканаўца камічных роляў. **19.** Усё разам: газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт (абрэв.). **21.** «Мужчыны дарма час не зводзяць // І хутка ... асушаюць, // Гаспадарам дабра жадаюць». З паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». **22.** Тое, што і іржа. **23.** У гасцях ..., а дома кулеш, ды за ... лепш (прык.). **26.** Які гаспадар, такіх і гасцей яму ... пасылае (нямецкая прык.).

Склаў
Лявон ЦЕЛЕШ

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

ОПЕРА *(заканчэнне артыкула)*. Героіка-патрыятычную накіраванасць мела і большасць операў 1940 – 1950-х гг. З вялікай цікавасцю тэатральная грамадскасць сустрэла оперы «Андрэй Касценя» Аладава (1947, лібрэта Глебкі паводле аповесці Э. Віленскага «Сын Беларусі» пра К. Заслонава), «Кастусь Каліноўскі» Д. Лукаса (1947, лібрэта М. Клімковіча), першую оперу для дзяцей «Марынка» Р. Пукста (1955, лібрэта Э. Агняцвет паводле яе паэмы «Песня пра піянерскі сцяг»), «Яснае світанне» А. Туранкова (1958, лібрэта А. Бачылы). 1960 – 1980-я гг. – перыяд жанравага ўзбагачэння опернага мастацтва. Створаныя лірыка-камедыйныя «Калючая ружа» Ю. Семянякі (1960, лібрэта Бачылы) і «Твая вясна» Я. Глебава (1963), лірыка-сатырычная «Калі ападае лісце» (1968, лібрэта Бачылы) і лірычная опера-паэма пра Максіма Багдановіча «Зорка Венера» (1970, лібрэта Бачылы) Семянякі, музычная драма «Джардана Бруна» С. Картэса (1977, лібрэта У. Халіпа), эпічная «Сівая легенда» Д. Смольскага (1978, лібрэта У. Караткевіча паводле яго аднайменнай аповесці), героіка-эпічная «Сцежкаю жыцця» (1980, лібрэта А. Вярцінскага і С. Штэйна паводле аповесці В. Быкава «Воўчая зграя») і тэлеопера «Ранак» (1967, лібрэта Я. Шабана па матывах паэмы А. Куляшова «Песня аб слаўным паходзе») Г. Вагнера.

У пачатку 1980-х гг. опера папоўнілася разнастайнымі ў жанравых і стылявых адносінах творамі. Сярод іх «Новая зямля» Семянякі (пастаноўка 1982, лібрэта А. Петрашкевіча паводле аднайменнай паэмы Якуба Коласа), востраактуальная публіцыстычная «Матухна Кураж» Картэса (пастаноўка 1982, лібрэта Халіпа і С. Штэйна паводле п'есы Б. Брэхта «Матухна Кураж і яе дзеці»), рамантычная «Францыск Скарына» Смольскага (1982, лібрэта С. Клімковіч), для дзяцей «Трыццаць два волаты» Н. Усцінавай (1982, лібрэта А. Таруціна), камічная «Пінская шляхта» Г. Вагнера (1985, лібрэта Шабана і А. Вольскага паводле аднайменнай камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча).

Сцэна з оперы «Дзікае паляванне караля Стаха»

З пастановак, ажыццёўленых на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі ў апошнія дзесяцігоддзі, варта адзначыць «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Солтана (1989; атрымала Дзяржаўную прэмію Беларусі), «Майстар і Маргарыта» Глебава, «Князь Наваградскі» А. Бандарэнкі (1992) ды іншыя. У тэатральным сезоне 2008/2009 адбылася прэм'ера беларускай камічнай оперы «Чужое багацце», рэканструяванай У. Байдавым і В. Скорабагатавым па партытурах кампазітара Я. Голанда.

Значнай падзеяй у гісторыі Беларускай оперы сталі маштабныя пастаноўкі операў «Вайна і мір» С. Пракоф'ева, «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» Д. Шастаковіча, «Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 26.05.2016
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 363.
Тыраж 688 асобнікаў.